Аляксей Сарока



...гэх, дастаць сякеры, куляметы,

разабраць на дзоты свае хаты...

# Дзіўныя рэчы

**Прылучэньне**

*Дыпціх*

*1.*

Сапраўдная вера цябе пераможа.
Фальклорныя бабкі сьпяваюць і плачуць.
А вечар, як сьветлае піва, харошы.
Калісьці ў такі ж мы глядзелі на качак.
А качкі ляцелі у сьвет, за вачыма,
Стаяла надвор'е, дрыжэлі калені.
Тых качак няма ўжо, і зноўку ні з чым мы.
Мае летуценьні – твае летуценьні.

*2.*

Срэбраны крыжык зламаў атэісты.
Вечар рахманы. Дарога дамоў.
Мы на дваіх пасядзелі – па трыста,
пры разьвітаньні – той крыжык знайшоў.

Дыктар ізноў загружаў пра нястачы.
Хай у пагаслым экране пасьпіць...
Кепска мне кепска. Стаміўся няйначай.
Сэрца кранаю. І сэрца баліць.

* * *

Дуэлянт застрэліўся сам,
вадзянік адпусьціў здабычу,
раскрышыла камень каса.
Так заўжды парушаецца звычай.

Пацякла па лузе рака,
ап’янелы скаціўся па сходах...
Гонар вымусіў — не ўцякаць.
Нараджаецца так свабода.

Нечакана знайшоўся адказ
і ня ў тэксьце, а так — між зносак:
я кахаю, але ня вас.
Вырашаюцца гэтак лёсы.

Між прарокаў даўно няма
пра шляхі да высновы спрэчак.
Я зьдзіўляюся,
а дарма:
Пачынаюцца дзіўныя рэчы.

* * *

Ёсьць вар’яты – хутка будзе вынік,
як і новыя, і новыя вар’яты.
Поўні ўжо не выплюхнуцца з плыні.
Ты ж заходзь на кубачак гарбаты.

Гэх, дастаць сякеры, кулямёты,
разабраць на дзоты свае хаты,
волавам заліць калючкі дроту...
Ты заходзь папіць са мной гарбаты.

Я ж яшчэ пільнуюся кілішка,
мой пакой ад постэраў стракаты.
На найлепшым – алімпійскі мішка.
Зоркі. Ноч. З пяці пярсьцёнкаў — краты.

## PROTESTA

Не глядзіце,
што гэтыя словы
маюць рытм
і якуюсь узьнёсласьць.
І наогул
прэтэнзіі маюць
называцца нібыта вершам.
Я прашу,
я прашу вас, панове,
зразумець –
я ня ўбіўся ў бясконцасьць,
што паэты
заўжды
шукаюць.
Гэты верш –
толькі спроба завершыць
спробы вершаў,
іх  сэнс напісаньня,
патлумачыць,
што жыць патрэбна
дужа проста,
каб мець памкненьне
да зьдзяйсьненьня
благіх жаданьняў
без абрыдлага
красамоўства.

## Аплікацыя

Дзе ў кут сьцяна уваходзіць роўна –
заўважна, што сьцяна старая.
Сьвятло згасае пасьлядоўна –
ў краіне сьветлай, дзе я ўміраю.
І для таго мне ня трэба сьведка
у белым доме ля сіняй бухты.
Схаваўшы ў нетрах сваіх прастору,
залева сьлёзы больш не хавае,
ды разглядзеўшы сьвятло за морам, —
я не самотны, я кнігу маю...
На жаль гартаюцца кнігі рэдка, —
Пан Марцін Кухта – таму ёсьць
сьведка...